# Дарогу маладым!

Не так даўно ў галерэі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва праходзіла выстава мастацкіх работ, якая была прымеркавана да 3-га Міжнароднага конкурса дзіцячага малюнка "На сваёй зямлі".

Гэтае мерапрыемства вядзе адлік ад пачатку XXI стагоддзя і праходзіць у межах Рэспубліканскага фестывалю школьнікаў і навучэнцаў "Дзень зямлі. Беларусь". У 2006 годзе конкурс набыў статус міжнароднага.

У гэтым годзе конкурс быў арганізаваны пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь а таксама ГА "Беларускі зялёны крыж". Удзельнікамі конкурса сталі звыш 10 тысяч юных талентаў ва ўзросце ад 5 да 21 года з 24 краін свету, сярод якіх, акрамя Беларусі, краіны бліжняга (Польшча, Расія, Літва, Украіна, Арменія) і дальняга (Англія, Германія, Канада, Кітай, Сербія і г.д.) замежжа. Акамя таго, удзел у конкурсе ўзялі такія экзатычныя краіны, як Індыя, Інданэзія, Малазія, Кенія, Таіланд і Філіпіны.

Старшынёй журы быў абраны кіраўнік конкурса, член Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь Гоманаў Леанід Міхайлавіч. Ацэньванне юных талентаў вялося згодна сямі ўзроставым катэгорыям.



Пераможцы конкурса былі ўзнагароджаны дыпломамі 1-й, 2-й і 3-й ступені, медалямі і падарункамі.

Прыемна адзначыць, што ў пяці з конкурсных катэгорый дыпламантамі 1-й ступені сталі нашыя землякі. Таксама вартымі высокай узнагароды былі работы канкурсантаў з Расіі, Індыі, Польшчы і Казахстана.